# ТВП Беларусі

Наша краіна далучылася да праграмы ТВП у 1996 годзе. Зараз у Беларусі налічваецца 49 тэрыторый, важных для птушак. Большасць з гэтых тэрыторый адносіцца да водна-балотных угоддзяў: верхавыя і нізінныя балоты, натуральныя поймы рэк, паплавы, леса-балотныя комплексы. Каля трэці плошчы тэрыторый, важных для птушак, не маюць пакуль нацыянальнага рэжыму аховы — такім тэрыторыям асабліва патрэбна ўвага захавальнікаў. Зараз на нашых ТВП ахоўваюцца ўсе віды птушак, занесеныя ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь, 10 з іх (вяртлявая чаротаўка, дубальт, вялікі грыцук, белавокі нырок, гусь-піскулька, сіваграк, вялікі арлец, чырвоны каршун, сокал-шулёнак, вялікі кулён) адносяцца да глабальна знікаючых відаў і блізкіх да іх. На беларускіх ТВП «Балота Званец» і «Балота Спораўскае» гняздуецца каля трэці сусветнай папуляцыі вяртлявай чаротаўкі, і яны маюць выключнае значэнне для захавання гэтага віда ў свеце.




**Здымкі:** С. Зуёнак, А. Казулін, В. Фядосенка, І. Башнёў, С. Левы, В. Лукшыц, forums.tut.by

# Маніторынг ТВП

Для таго, каб эфектыўна захоўваць тэрыторыі, важныя для птушак, неабходна рэгулярна адсочваць змены, якія там адбываюцца і своечасова рэагаваць на пагрозы. Для гэтага распрацавана праграма маніторынгу ТВП, у якой прымаюць удзел адпаведныя спецыялісты. Аднак самую аператыўную інфармацыю можна атрымліваць толькі ад людзей, якія жывуць паблізу ад гэтых тэрыторый і маюць магчымасць рэгулярна іх наведваць. Важная роля ў гэтым адводзіцца менавіта захавальнікам ТВП.

**На што трэба звяртаць увагу ў першую чаргу:**

- экстрэмальныя сітуацыі (пажары, павадкі, прамысловыя і іншыя забруджванні тэрыторый і г.д.);
- парушэнні ахоўнага рэжыму (браканьерства, несанкцыянаваная гаспадарчая дзейнасць, незаконнае наведванне тэрыторый і г.д.);
- знікненне альбо змяншэнне колькасці жывёл і раслін на дадзенай тэрыторыі.



Праграма вызначэння тэрыторый, важных для птушак (ТВП), у Беларусі выконваецца грамадскай арганізацыяй «Ахова птушак Бацькаўшчыны» (АПБ) – афіцыйным прадстаўніком міжнароднай асацыяцыі BirdLife International у Беларусі. Больш інфармацыі пра дзейнасць АПБ і захавальнікаў ТВП можна атрымаць у сакратарыяце АПБ: г. Мінск, вул. Макаёнка 8-313;
тэл. 8 (017) 263-06-13, 8(029)223-06-13, 8(029)101-68-87; e-mail: info@ptushki.org
**www.ptushki.org**

# ТЭРЫТОРЫІ, ВАЖНЫЯ ДЛЯ ПТУШАК



BirdLife IBA
ТЭРЫТОРЫЯ ВАЖНАЯ ДЛЯ ПТУШАК

## Што такое праграма ТВП?

Міжнародная праграма «Тэрыторыі, важныя для птушак» (ТВП) (Important Bird Areas (IBA)) пачала дзейнічаць у 80-х гадах XX стагоддзя па ініцыятыве міжнароднай прыродаахоўнай асацыяцыі Birdlife International. Праграма накіравана на выяўленне і захаванне тэрыторый, якія маюць важнае значэнне для жыцця птушак.

Зараз у ёй удзельнічаюць каля 200 краін ва ўсім свеце, у якіх выдзелена больш за 11000 ТВП, якія ўключаюць месцы гнездавання, міграцый і зімовак птушак.


Вялікі грыцук


Вяртлявая чаротаўка


Белавокі нырэц


Дубальт


Вялікі арлец


Сіваграк

## Што такое тэрыторыі, важныя для птушак?

Адной з асноўных прычын знікнення відаў жывёл і раслін з'яўляецца знішчэнне іх натуральных месцаў пражывання. Таму адным з найбольш эфектыўных метадаў аховы большасці рэдкіх і многіх звычайных відаў птушак з'яўляецца захаванне каштоўных прыродных тэрыторый, неабходных для іх выжывання.

ТВП – гэта тэрыторыя, якая з'яўляецца жыццёва важнай для захавання папуляцыі аднаго альбо некалькіх відаў птушак падчас гнездавання, зімоўкі альбо міграцыі.

Гэтыя тэрыторыі выдзяляюцца на аснове пэўных крытэрыяў, распрацаваных міжнароднай сеткай прыродаахоўных арганізацый BirdLife International.

Стварэнне ТВП дае падставы для ўсталявання на іх рэжыму, альбо для правядзення прыродаахоўных мерапрыемстваў, што вельмі важна для захавання не толькі птушак, але і біяразнастайнасці ўвогуле.




## Хто такія захавальнікі ТВП?

Калі Вы – неабыякавы да лёсу прыроды роднага краю, маеце магчымасць рэгулярна наведваць зручную для Вас тэрыторыю, важную для птушак, і кантраляваць яе стан, Вы можаце стаць адным з захавальнікаў ТВП і разам з намі садзейнічаць іх існаванню ў будучыні.

З дапамогай захавальнікаў мы рэгулярна і аператыўна атрымліваем інфармацыю пра стан ТВП і ўзнікаючыя пагрозы; праводзім практычныя мерапрыемствы па захаванню птушак і ТВП, а таксама аднаўленню экасістэм; садзейнічаем экалагічнай асвеце сярод насельніцтва.

**Захавальнікам ТВП можа стаць кожны аматар прыроды!**

У дапамогу захавальнікам распрацаваны інфармацыйныя матэрыялы і арганізуюцца семінары-трэнінгі, прыняць удзел у якіх можа кожны.

Каб стаць захавальнікам ТВП, паведаміце Вашу кантактную інфармацыю ў сакратарыят АПБ па тэлефоне (017) **263-06-13** або праз e-mail info@ptushki.org





